# «ВОСЕНЬ СЯРЭДНЯВЕЧЧА»: ТРАДЫЦЫІ ПАХАВАЛЬНЫХ ПРАЦЭСІЙ БЕРАСЦЕЙСКІХ МЯШЧАН XVII СТ.

**В. У. Шылай**

Мінск, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, vshylai@tut.by

Аўтар даказвае, што пэўныя аспекты пахавальнай традыцыі: плата за ўдзел у працэсіі, права карпарацыі ісці за целам, атрымалі сваё гістарычнае развіццё. Вырашэнне канфлікту ў Парыжы XV стагоддзя было сітуатыўным (цырымоніймайстар абяцаў заплаціць з уласнай кішэні), а вырашэнне канфлікту ў Берасці набыло юрыдычнае абгрунтаванне.

*Ключавыя словы:* пахавальная традыцыя;  канфлікталогія; сітуатыўнае рашэнне.

The author proves that certain aspects of the funeral tradition: the payment for participation in the procession, the right of the corporation to follow the body, have received their historical development. The solution of the conflict in Paris of the XV century was situational (the master of ceremonies promised to pay out of his own pocket), and the solution of the conflict in Brest acquired a legal justification.

*Keywords:* funeral tradition; conflictology; situational solution.

Смерць з’яўляецца заканамерным і лагічным завяршэннем жыцёвага шляху. За многія стагоддзі гісторыі чалавецтва былі распрацаваны механізмы сацыяльна-псіхалагічнай абароны, якія дапамагалі перажыць гэтую непазбежную падзею. Адным з такіх механізмаў з'яўляецца пахавальны рытуал.

Як ён выглядаў у сярэднявеччы? Вось, што пісаў вядомы французскі гісторык-медыявіст Жорж Дзюбі: «Смерть – это переход. На земле остается одно лишь мертвое тело. И вокруг него надлежит устроить торжественный церемониал.

Обычай требует устройства последнего праздника, как по случаю свадьбы или въезда принца в город своих добрых подданных, требует пышного окружения для героя – умершего. Его прах наряжают, гримируют, а если покойник был достаточно богат, то и бальзамируют, на продолжительное время выставляют напоказ, толпы друзей, собратьев и нищих сопровождают его до последнего прибежища» [1, с. 282–283].

Подобнае шыкоўнае пахавання атрымаў кароль Францыі Карл VII у 1460 годзе. Апісанне працэсіі паводле твору тагачаснага гісторыка Алена Шарц'е прыводзіць аўтар XIX стагоддзя Эжэн Віале-ле-Дзюк: «В среду, пятый день августа, в десять часов вечера, тело короля Карла привезли в Париж, пребывало же оно вне стен города, в церкви Богоматери-на-Полях, где покоилось до следующего дня, когда перенесли его в собор Парижской Богоматери. За четыре угла покров держали четыре советника парламента, одетые в пунцовые мантии, и еще несколько советников парламента, в одеяниях алого цвета, поддерживали покров.

Вслед же за ними тело под балдахином из золотой ткани несли двадцать шесть членов гильдии соленосов (салемеры (henouars) мелі выключны прывілей на перанос каралеўскага цела – В. Ш.), следовали монсеньор герцог Орлеанский, монсеньор граф Ангулемский, монсеньор д’Э и граф де Дюнуа, все четверо – верхом и в траурных одеждах.

Далее двигалась повозка, на которой тело везли от Меёна до Парижа; она была покрыта черным бархатом, со всех сторон – спереди, сзади и по бокам – отмечена большим белым крестом из бархата. В телегу впряжено пять лошадей под накидками из рытого черного бархата, ниспадающими до земли, и видны были у тех лошадей лишь глаза. За телегой ехали шесть пажей в черном бархате и черных же капюшонах верхом на шести лошадях в попонах из черного бархат» [2, с. 138].

Аднак, падчас працэсіі ўспыхівае канфлікт, на які асобую ўвагу звяртнуў славуты нідэрландскі медыявіст пачатку XX стагодзя Ёган Хёйзінга ў кнізе «Восень сярэднявечча»: «Прибыв по пути в Сен-Дени в Круа-о-Фьен, солемеры после словесного препирательства с монахами аббатства отказываются нести дальше тело короля, если им не заплатят десяти парижских ливров, на которые, по их утверждениям, они якобы имеют право. Они оставляют погребальные носилки прямо посреди дороги, и траурный кортеж вынужден продолжительное

время топтаться на месте. Горожане Сен-Дени хотят уже взяться за это сами, но grand écuyer [обершталмейстер] обещает заплатить солемерам из своего кармана, и кортеж получает возможность двинуться дальше – чтобы достигнуть церкви лишь к восьми часам вечера. Сразу же после погребения вспыхивает новая ссора: королевский grand écuyer сам вступает в спор с монахами о том, кому достанется королевское платье» [3, с. 87–88].

Традыцыя шыкоўных пахаванняў у Францыі давала прыклад для шмат якіх заходнееўрапескіх краін, у тым ліку Рэчы Паспалітай.

Польскі даследчык Юліўш Хросціцкі ў сваёй кнізе Pompa Funebris: z Dziejów kultury stsropolskiej звяртаў ўвагу, на тое, што пахавальным працэсіям, якія ў Францыі ладзіліся герцагам, спрабаваў раўняцца сярэдні шляхціч. Адсюль шматлікія пазыкі і заставы, звязаныя з пахаваннямі [4, s. 346].

У той жа самы час, як паказала гісторыя, былі запазычаны не толькі шыкоўнасць, але таксама і патэнцыял канфліктных становішчаў, звязаны з барацьбой за правы ў пахавальных шэсцях.

Аб гэтым сведчыць разбор скаргі цэхмістраў кавалёў, слесараў і рымараў супраць кушнерскага цэха (займаліся апрацоўкай футра, пашыў шапак, адзення з яго). Кніга Берасцейскага магістрата за 1624 г. утрымлівае дзве скаргі повадавага бока і адну рэпратэстацыю адказчыкаў.

Далей ідзе вырак па гэтай справе бурмістра-радзецкай лавы Берасцейскага магістрата і яшчэ адзін з дазволам кушнерам на далейшы разгляд перад войтам [5, с. 245–252]. Рэканструкцыя падзей па гэтых дакументах дае наступную карціну.

Першая скарга паступіла ў суд 11 ліпеня 1624 г. Прадстаўнікі цэхаў кавалёў, слесараў, рымараў, кушнераў былі наняты для ўдзелу ў пахаванні Кіевецкага ўрадніка Крыштафа Венцкоўскага.

Пры вынасе цела парадак цэхаў быў наступны: кушнеры, кавалі з слесарамі і рымарамі, краўцы. Працэсія накіроўвалася да касцёла. Кожны цэх нёс свае пахавальныя насілкі (мары), у руках яны трымалі свечы.

Прычынай канфлікту па меркаванню расійскага гісторыка, археографа Івана Спрогіса сталася тое, што кушнеры спазніліся, а кавалі занялі іх месца перад краўцамі: «Но на пути скорняжеский цех – поспешил присоединиться к церемонии со своими цеховыми знаками и знаменами; он стал ломиться между портняжским и кузнецким цехами» [5, с. XLV].

Кавальскія цэхмістры ў сваёй скарзе апісвалі пачатак канфлікта наступным чынам: «…калі мы шлі з свечкамі і марамі пры целе вышэй згаданага (урадніка Венцкоўскага) пры гэтым рушылі з марамі і свечкамі пры целе кушнеры, а за імі наш кавальскі цэх з марамі, а за нашым цэхам кравецкія мары, але яны, забыўшыся на Бога, Божага страха, учынілі смуту перад зборам вельмі паважаных людзей тады, каля жыдоўскага дома, перад школьнікам».

Падчас цырымоніі кушнеры справакавалі кавалёў і слесараў, заўважыўшы, што ім нягодна хадзіць перад краўцамі. Падвыпіўшы слесар Габрыель пачаў валіцца на насілкі, якія неслі кушнеры, так, што апошнія ўпалі.

Кушнерскія цэхмістры сведчылі наступным чынам: «Мы шлі згодна парадку перад кравецкім цэхам, калі той слесар Габрыель з іншымі сваімі памагатымі, папярэдне напіўшыся, ўпаўшы на нашы мары, якія былі пакрыты цэхавай камчой (шаўковай тканінай – В. Ш.), пхнуў так, што нашы братчыкі, якія (іх) неслі, упалі, пад час чаго нашы кушнерскія камчы былі сапсаваны і парваны, чынячы непатрэбнае разбурэнне ў каралеўскім месце».

На заўвагу кушнерскага цэхмістра ў іх бок паляцелі абразы: лупікоты (кашкадралы – В. Ш.) і няўчцівай маці сыны (*łupikotami i nieutcziewey matki synami y inszych słów złych niemało zadali*)[1], у тым ліку пагрозы зарубіць сякерай (обухам – В. Ш.).

Становишча пагаршалася тым, што ганьба адбылася перад вялікай колькасцю людзей каля дома габрэя-школьніка.

У сітуацыі разгляда канфлікта з пункта гледжання суда акрэсліваюцца дзве прававыя праблемы: наяўнасць прысягі гораду ў удзельнікаў канфлікту і абгрунтаванне парадку следавання падчас працэсій. Умовай далейшага разгляду справы гучыць прысяга гораду ў

[1] Наогул, дыяпазон мяшчанскай лаянкі ў тыя часы быў дастаткова шырокім: machlarze, złodzie, cyganie, poganie [5, с. 253].

ратушы и, адпаведна, пераход пад юрысдыкцую горада, а потым следаванне поводле цэхавых вількераў.

Довады бакоў і спасылкі на традыцыю і права згодна ардынацыі падчас працэсіі гучаць наступным чынам: сваім парадкам паводле старага звычаю, як на працэсіі Божага Цела і як на ўсялякія пахаванні ходзяць, кушнерскія цэхмістры прадставілі прывілей караля Стэфана ад 01.04.1579 г., падцвярджальны прывілей Сігізмунда III ад 10.01.1591 г., а таксама ўказалі на кравецкі цэх як сведкаў традыцыі хадзіць кушнерам перад краўцамі.

У сітуацыі разгляда канфлікта вачамі цэхмістраў – судовых фігурантаў, справы акрэсліваюцца наступныя маральна-этычныя праблемы: абраза цэхавых сцягаў, пагрозы і абразы, ганьба перад вялікай колькасцю людзей.

Адстойванне гонару кушнерскага цэха выяўляецца ў наступных довадах «...за тое, што называюць лупікотамі, мы паказваем, што мы маем нададзены ў прывілеях за герб “кучму (шапку – В. Ш.) з собаля” і з любельскім кушнерскім цэхам вольнасці і парадкі ўжываем. А тое, што падчас працэсіі мы ходзім пры кравецкім цэхе, то таму што мы добраахвотна, дзеля касцёльных парадкаў краўцам саступілі хадзіць і першае месца яны маюць на працэсіі, бо не вельмі адрозніваецца кушнерскае рамяство ад кравецкага, бо таксама шыюць іглой як і яны, і гатовы краўцоў ставіць на сведчанне і іншых людзей, што так здаўна ходзяць».

Такім чынам, яны самі добраахвотна саступілі першае месца ў працэсіі і не адчуваюць сябе абражанымі перад краўцамі, у той час як кавалі парушылі іх права. Больш таго яны абазвалі іх кашакадраламі. У дадзеным выпадку прыходзіць на думку наступны кантэкст абразы цэха: яны шыюць не з собаля, а замяняюць яго больш таннымі скурамі. Гэта і іншыя абразы так і застаюцца актуальнымі і стаюць прычынай для накіравання для разгляду ў войтаўскім судзе.

17 ліпеня 1624 г. суд пастанавіў, каб кушнерскі цэх перад краўцамі хадзіў, а за імі ўсе астатнія згодна іх правам. Але кушнерскіх цэхмістраў пасадзілі на тыдзень у ратушную вязню па наступнай фармуліроўцы: «А за тое, што непатрэбную смуту падчас працэсіі ўчынілі, за такое свавольства, што самі сабе чынілі справядлівасць».

23 ліпеня 1624 г. судовы ўпаўнаважаны ад кушнерскага цэха з’явіўся ў суд для атрымання свайго права скардзіцца на кавалёў берасцейскаму войту за знявагу і абразу іх цэха. Пры гэтым сітуацыя з кушнерскімі цэхмістрамі ў вязні засталася яшчэ невысветленай: ці яны ўжо выйшлі з вязні ці працягвалі сядзець.

Па-сутнасці справы можна вылучыць яшчэ два аспекты, відавочна нябачныя для тагачасных удзельнікаў судовай справы: 1) матэрыяльныя падмуркі, звязаныя з пахавальным шэсцям і 2) п’янства ў грамадскім месцы (з’яўленне ў нецвярозым стане перад вялікай колькасцю людзей і ўчыненне бойкі).

Абодвы аспекты перакрыжываліся ў скарзе, пададзенай лаўнікам-краўцом Іванам Дзіспутам 26 сакавіка 1638 г. Ён скардзіўся на кравецкіх цэхмістраў за няправільнае распараджэнне бюджэтам цэха. Сярод іншага прагучала скарга, што ў грашовых рэгестрах пішуць, што хочуць і «прапіваюць пахавальныя грошы». Суд пастанавіў штогод трымаць справаздачу аб расходах і «Пахавальныя грошы павінны належаць толькі тым, якія былі на пахаванні, а хто не быў на пахавальнай працэсіі ці да пачатку не прыйшоў, той страчвае ўзнагароду (poczęstkę), і супраць таго, як апісана ў вількеры будзе павінен заплаціць» [5, с. 301].

Канешне, правамернасць параўнання прыведзенага канфлікта ў Парыжы і канфлікта ў Берасці, адбыўшыхся падчас пахавальных працэсій можа паказацца некарэктнай, але гэта толькі на першы погляд. Пэўныя аспекты пахавальнай традыцыі: аплата за ўдзел у працэсіі, права следаваць за целам цэхавых братчыкаў, – атрымалі сваё гістарычнае развіццё. Вырашэнне канфлікта ў Парыжу XV ст. было інтуіцыйным, сітуатыўным (распарадчык цырымоніі абяцаў заплаціць з уласнай кішэні), а вырашэнне канфлікта ў Берасці набыло прававое абгрунтаванне.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Дюби Ж. Европа в средние века. Смоленск : Полиграмма, 1994.
2. Виолле-ле-Дюк Э. Э. Жизнь и развлечения в средние века. СПб. : Евразия, 1997.
3. Хёйзинга Й. Осень Средневековья. СПб. : Изд. Ивана Лимбаха, 2011.
4. Chrościcki J. A. Pompa funebris: z dziejów kultury staropolskiej. Warszawa, 1974.
5. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. Т. VI. Вильна, 1872.